# ЯК ЛЮДЗІ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЬ МАРУ

Не дзіуна, што на падрыхтоучым аддзяленні можна сустрэць людзей з цікавым мінулым, у якіх за плячамі вялікая працоуная біяграфія. Пра некаторых з іх я хачу расказаць.

Прайшоўшыя пасля заканчэння школы сем гадоў унеслі вялікія змены у жыццё Аліны Клус. Дастаткова сказаць, што яна двойчы выбіралася дэпутатам у Жодзінскі гарадскі Савет. Аліна тры гады была сакратаром камсамольскай арганізацыі на аутамабільным заводзе у Жодзіна. Прыйшла яна туды працаваць токарам, а пасля паспяховага заканчэння аутамеханічнага тэхнікума стала кантралёрам. Аліна— член абласнога і раённага камітэтау камсамола, дэлегат XXV з'езда ЛКСМБ.

Зусім не выпадкова Аліна вырашыла стаць юрыстам. Грамадская праца для яе не толькі абавязак, але і любімая справа. Пастаянная сувязь з людзьмі з'явілася галоунай прычынай далейшага выбару. Юрыст — цяжкая і адказная прафесія, патрабуючая глыбокай зацікауленасці, адданасці сваёй справе, і да усяго гэтага, ускладаючая дадатковыя абавязкі на таго, хто вырашыу прысвяціць сваё жыццё людзям, быць іх верным сябрам і памочнікам. Несумненна, Аліна Клус стане выдатным спецыялістам.

Леанард Краучук пасля васьмі класау пайшоу працаваць на абутковую фабрыку г. Ліды. Хутка ён быу прызваны у армію, папау у сапёрныя войскі. Вярнуушыся у родны горад, Леанард працавау на аутарамонтным заводзе і адначасова вучыуся у вячэрняй школе. Грамадскай дзейнасцю пачау займацца рана. На заводзе яго не раз выбіралі у цэхавы камітэт прафсаюза і заводскі камітэт камсамола. Краучук быу і старшынёй народнага кантролю, займауся спортам: зараз кандыдат у майстры па вольнай барацьбе. Чаму прыйшоу ва універсітэт? Вырашыу, нарэшце, здзейсніць дауней-шую мару — стаць выкладчыкам любімага прадмета— гісторыі.

Акрамя Аліны і Леанарда, на падрыхтоучым аддзяленні займаецца шмат цудоуных рабят. Гады вытворчай працы далі ім добрую загартоуку, мэтанакіраванасць.

Л. ШЧАРАНКОВА.



Пяцікурснікі біялагічнага факультэта здаюць дзяржэкзамен па навуковаму камунізму. У камісіі—старшыя выкладчыкі Т. Пашкоускі, П. Карака, В. Чарнагузаў.

Фота А. ДЫНіКАВА.





# У ВНУ КРАІНЫ

### ПАТЭНТ З ЗША

✦ Растоускі дзяржауны універсітэт атрымау патэнт са Злучаных Штатау Амерыкі на вынаходніцтва: «Спосаб умацавання зуб'яу зубчастых колау і абсталяванне для яго здзяйснення». Новы спосаб распрацаваны у навукова-даследчым інстытуце механікі і прыкладной матэматыкі, у лабараторыі канструктыунай трываласці.

Патэнтна-прававая абарона новай распрацоукі зроблена з атрымання патэнтаўтрымальнікам (універсітэтам) выключнага права у ЗША на выкарыстанне распрацаванага спосабу і магчымай рэалізацыі зацікауленымі асобамі толькі па ліцэнзіі.

Створаны спосаб умацавання зуб'яу з'яуляецца больш эфектыуным у параунанні з існуючымі спосабамі. У цяперашні час ён рэалізуецца на многіх машынабудаунічых прадпрыемствах нашай краіны.

(«За советскую науку», Ростоускі універсітэт).

### ВЫСТУПІЛІ ЛЕПШЫЯ

✦ Студэнцкая навуковая канферэнцыя «Буржуазнай ідэалогіі — рашучы бой» прайшла на ваеннай кафедры Ленінградскага універсітэта. У ёй прынялі удзел студэнты факультэта журналістыкі, філалагічнага, усходняга. У конкурсе на лепшы рэферат удзельнічала больш 200 чалавек.

У гэты дзень кожны, хто прыйшоу у Пакой баявой славы, быу гатовы выступіць з цікавым паведамленнем. З прачытаных дакладау лепшымі былі: «Друк Шпрынгера на службе імперыялізму», «Скажэнне нацыянальнай палітыкі КПСС буржуазнымі ідэолагамі», «Ленін аб ідэалагічнай барацьбе».

(«Ленинградский университет», ЛДУ).

### НОВАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

✦ У гэтым навучальным годзе студэнты Ленінградскага электратэхнічнага інстытута імя У. І. Ульянава (Леніна) займаюцца па відазмененых вучэбных планах. На усіх факультэтах уведзена новая дысцыпліна — «Навукова - даследчая праца». Павялічаны час заняткау па прымяненню вылічальнай тэхнікі, па пытаннях мікраэлектронікі, па тэорыі кіравання і АСК.

У якасці эксперыменту у плане курса «Арганізацыя вытворчасці» чытаецца цыкл лекцый аб ролі, месцы і задачах вытворчых і навукова-вытворчых аб'яднанняу.

(«Студенческий меридиан»)

# КАРЫСНАЯ СУСТРЭЧА

Па устанавіўшайся традыцыі выкладчыкі кафедры дзяржаунага права і савецкага будауніцтва юрыдычнага факультэта (А. А. Галауко, Я. М. Тагуноу, А. Т. Лейзерау, Л. А. Прыходзька, В. П. Сярэбранікау і аутар гэтых радкоу) выехалі у Вільнюс, каб правесці там чарговае сумеснае пасяджэнне з кафедрай дзяржаунага права юрыдычнага факультэта Вільнюскага дзяржаунага універсітэта імя В. Капсукаса.

Пасяджэнне адкрыу загадчык кафедры дацэнт К. А. Лапінскас. У павестку дня была уключана адна праблема: «Арганізацыйныя і вучэбна-метадычныя пытанні падрыхтоукі юрыстау па дзяржауна-прававой спецыялізацыі». Для усебаковага абмеркавання праблемы К. А. Лапінскас прапанавау разгледзець наступныя пытанні:

1) агульныя пытанні арганізацыі дзяржауна-прававой спецыялізацыі;

2) абмен вопытам падрыхтоукі і чытання асобных спецкурсау па дзяржауна-прававой спецыялізацыі;

3) арганізацыя вучэбнай і вытворчай практыкі студэнтау дзяржауна-прававой спецыялізацыі.

У нашым універсітэце ужо пяць гадоу рыхтуюць студэнтау па гэтай спецыялізацыі, а нашы калегі з Вільнюса толькі пачынаюць спрабаваць свае сілы у гэтым. Мы з задавальненнем згадзіліся падзяліцца вопытам.

У сваім выступленні прафесар А. А. Галауко сказау: «Пяць-шэсць год таму назад паміж нашымі кафедрамі устанавіліся добрыя узаемаадносіны, а цяпер такія адносіны устанауліваюцца паміж нашымі універсітэтамі: нядауна паміж імі заключаны дагаворы. Хутка будуць заключаны дагаворы і паміж нашымі факультэтамі.

На сустрэчы у 1974 годзе мы абмяркоувалі такія актуальныя праблемы, як методыка правядзення семінарскіх заняткау па дзяржауна-прававых дысцыплінах; аб формах сувязі кафедр з дзяржаунымі органамі.

Цяпер скажу некалькі слоу аб тым, як пачала здзяйсняцца на нашым факультэце дзяржауна-прававая спецыялізацыя, якія пры гэтым у нас узніклі праблемы і як мы іх вырашалі.

Мы спадзяваліся, што дзяржауна-прававая спецыялізацыя перарасце на нашым факультэце у аддзяленне савецкага будауніцтва. Але гэтага не атрымалася. Калі раней, напрыклад, у 1972 годзе, у нас спецыялізавалася 50 студэнтау, то зараз іх толькі 35. Мы распрацавалі і увялі 8 спецкурсау, рыхтуем, на наш погляд, нядрэнных спецыялістау, а вось пры размеркаванні іх сустракаемся з вялікімі цяжкасцямі. Як відаць, з такімі цяжкасцямі сустрэнецеся і вы.

— Мы не баімся таго, што нашы выпускнікі не будуць размеркаваны на работу у Саветы,—пачау сваю прамову К. А. Лапінскас.—І вось чаму. Вялікую дапамогу у гэтай справе нам аказваюць Прэзідыум Вярхоунага Савета і Савет Міністрау Літоускай ССР. Яны зацікаулены, каб у мясцовых органах дзяржаунай улады нашай рэспублікі на кіруючых пасадах былі юрысты. Так, Савет Міністрау Літоускай ССР зрабіу пералік пасад у выканкомах мясцовых Саветау, якія павінны займаць асобы з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй. З улікам патрабаванняу гэтай пастановы мы з 1974 навучальнага года пачалі рыхтаваць спецыялістау па дзяржаунаму праву. Жадаючых было многа, але мы узялі пакуль 15 чалавек.

У працэсе абмену думкамі мы высветлілі і шэраг іншых цікавых пытанняу. Напрыклад, тое, што выкладчыкі кафедры дзяржправа Вільнюскага універсітэта чытаюць такія ж спецкурсы, як і мы, аднак некаторыя з іх выкладаюцца у больш шырокім плане. Так, мы чытаем для студэнтау спецкурс «Прававая ахова прыроды у СССР», а нашы калегі — спецкурс «Прававая ахова акружаючага асяроддзя».

На нашай кафедры для студэнтау-завочнікау чытаецца невялікі спецкурс (16 гадзін) «Органы народнага кантролю у СССР», выкладчыкі ж кафедры дзяржправа Вільнюскага універсітэта чытаюць спецкурс «Дзяржауны кантроль у СССР» (32 гадзіны), у які уваходзіць асобным раздзелам і народны кантроль у СССР як адзін з відау кантролю.

У нас чытаецца невялікі спецкурс «Асновы навукі кіравання», у Вільнюскім універсітэце чытаецца спецкурс (32 гадзіны) «Асновы сацыяльнага кіравання, у які уваходзяць асобным раздзелам і «Асновы навукі кіравання».

На кафедры дзяржаунага права Вільнюскага універсітэта у гэты час чытаецца 8 спецкурсау па дзяржауна-прававой спецыялізацыі, а у недалёкім часе іх будзе 10. Думаецца, што усё гэта дазволіць паспяхова рыхтаваць спецыялістау для работы у органах дзяржаунай улады і кіравання.

Шэраг спецкурсау выкладчыкі кафедры дзяржправа Вільнюскага універсітэта чытаюць і для студэнтау, якія спецыялізуюцца на іншых кафедрах. Але яны пакуль не прадугледзелі выкладанне такіх спецкурсау, як «Саветы і грамадскія арганізацыі» і «Справаводства у мясцовых Саветах».

На пасяджэнні выявілася, што як у нас, так і у нашых калег не хапае метадычных матэрыялау па спецкурсах. Аднак выкладчыкі Вільнюскага універсітэта ужо узяліся за вырашэнне гэтай праблемы.

Дацэнт П. В. Петкявічус піша дапаможнік па спецкурсу «Адміністрацыуная адказнасць у СССР», ст. выкладчык А. П. Марцыёнас — дапаможнік па спецкурсу «Прававая ахова акружаючага асяроддзя». Сумеснымі намаганнямі яны рыхтуюць дапаможнік «Арганізацыя работы у мясцовых Саветах», «Зборнік нарматыуных актау па адміністратыунай адказнасці» і шэраг іншых дапаможнікау. Гэта паведамленне прымусіла нас сур'ёзна задумацца і перагледзець планы падрыхтоукі вучэбных дапаможнікау для студэнтау дзяржауна-прававой спецыялізацыі.

З вялікай увагай было выслухана выступленне дацэнта А. Т. Лейзерава, які расказау, што у працэсе выкладання спецкурса «Дзейнасць мясцовых Саветау па кіраунііцтву галінамі народнай гаспадаркі і культуры» ён выкарыстоувае розныя формы замацавання матэрыялу — наведванне са студэнтамі сесій Вярхоунага Савета БССР, мясцовых Саветау і разбор іх на семінарскіх занятках, наведванне аддзелау Прэзідыума Вярхоунага Савета і Савета Міністрау БССР.

Карысная размова адбылася і па трэцяму пытанню — арганізацыя вучэбнай і вытворчай практыкі студэнтау, якія спецыялізуюцца на кафедры дзяржправа.

Мы расказалі аб тых цяжкасцях, з якімі сустрэліся пры кірауніцтве вытворчай практыкай студэнтау дзённай і завочнай форм навучання.

Студэнты, якія спецыялізуюцца на кафедры дзяржаунага права Вільнюскага універсітэта, хаця у іх і не уведзена дзяржауна-прававая спецыялізацыя, праходзяць вытворчую практыку і у Саветах. Перш за усё, у адрозненне ад арганізацыі вытворчай практыкі студэнтау дзяржауна-прававой спецыялізацыі на юрфаку нашага універсітэта, дзе студэнтау пасылаюць на практыку у міністэрствы і цэнтральныя ведамствы (а там няма умоу для праходжання практыкі) вільнюскія калегі арганізуюць практыку толькі у выканкомах раённых Саветау дэпутатау працоуных. Прычым, адпаведна праграме, студэнты пачынаюць практыку з агульнага аддзела выканкома (5 дзён), затым на працягу 10 дзён вывучаюць у аргінструктарскім аддзеле дзейнасць загадчыка і інструктарау і толькі пасля гэтага пераходзяць у аддзел унутраных спрау і у другія аддзелы выканкома, туды, дзе напэуна будуць працаваць будучыя спецыялісты.

Думаецца, што такое вырашэнне пытання аб праходжанні практыкі у Саветах, яе паслядоунасць прыймальна і для нас.

П. ГРЫНКІН.

